ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

17 верасня 1997 г. № 1231

г. Мінск

## 882 Аб Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзеныя:

Палажэнне аб Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА;

склад Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА*.

2. Дазволіць Міністэрству замежных спраў па ўзгадненню з зацікаўленымі міністэрствамі, іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, творчымі саюзамі і грамадскімі аб'яднаннямі Рэспублікі Беларусь уносіць частковыя змены ў склад Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА.

3. Прызнаць страціўшай сілу пастанову Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 студзеня 1995 г. № 32 "Аб складзе Камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА" (Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 2, арт. 37).

Прэм'ер-міністр
Рэспублікі Беларусь **С. Лінг**

---

*Не прыводзіцца.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
17.09.1997 № 1231

## ПАЛАЖЭННЕ

### аб Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА

1. Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА (далей — Нацыянальная камісія) створана ў мэтах выканання міжнародных абавязацельстваў, што вынікаюць з членства Рэспублікі Беларусь у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

Нацыянальная камісія з'яўляецца міжведамасным органам, адказным за ўзаемадзеянне з ЮНЕСКА беларускіх дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый і прыватных асоб, якія дзейнічаюць у мэтах развіцця адукацыі, навукі, культуры, камунікацыі і інфармацыі. Нацыянальная камісія выконвае кансультатыўную функцыю пры Урадзе Рэспублікі Беларусь па ўсіх праблемах, што датычацца ЮНЕСКА, а таксама функцыю органа сувязі па ўсіх адпаведных пытаннях.



Нацыянальная бібліятэка Беларусі

2. Нацыянальная камісія ў сваёй дзейнасці кіруецца Статутам ЮНЕСКА, Статутам нацыянальных камісій па справах ЮНЕСКА, заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дадзеным Палажэннем.

3. Асноўнымі задачамі Нацыянальнай камісіі з'яўляюцца:

распрацоўка прапаноў па пытаннях пазіцыі Рэспублікі Беларусь адносна супрацоўніцтва з ЮНЕСКА;

вызначэнне прыярытэтных для Рэспублікі Беларусь напрамкаў супрацоўніцтва ў рамках ЮНЕСКА;

заахвочванне і садзейнічанне актыўнасці ўстаноў Рэспублікі Беларусь, якія ўзаемадзейнічаюць з ЮНЕСКА.

4. Нацыянальная камісія ў адпаведнасці з ускладзенымі на яе задачамі:

забяспечвае прыцягненне дзяржаўных устаноў, грамадскіх і іншых арганізацый, навучальных і навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў да ўдзелу ў мерапрыемствах і праграмах ЮНЕСКА, накіраваных на развіццё адукацыі, навукі, культуры і камунікацыі, а таксама каардынацыю іх дзейнасці;

прадстаўляе рэкамендацыі для выпрацоўкі пазіцыі ўрадавых дэлегацый Рэспублікі Беларусь у рабочых органах ЮНЕСКА, а таксама садзейнічае рабоце афіцыйных дэлегацый Рэспублікі Беларусь падчас міжурадавых сустрэч, якія праводзяцца ЮНЕСКА;

прадстаўляе інфармацыю зацікаўленым дзяржаўным органам, грамадскім аб'яднанням аб магчымасцях міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках праграм ЮНЕСКА;

супрацоўнічае з нацыянальнымі органамі, дзейнасць якіх звязана з праграмамі і праектамі ЮНЕСКА;

падтрымлівае зносіны з нацыянальнымі камісіямі па справах ЮНЕСКА іншых дзяржаў;

распаўсюджвае інфармацыю аб мэтах, праграмах і дзейнасці ЮНЕСКА, якая паступае з названай арганізацыі або з іншых краін і датычыцца праблем, што ўяўляюць цікавасць для развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі, навукі, культуры, інфармацыі;

спрыяе выкананню нацыянальных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў рамках праграм ЮНЕСКА;

удзельнічае ў падборы кандыдатаў для работы ў апараце Сакратарыята ЮНЕСКА ў розных краінах;

правoдзіць ацэнку эфектыўнасці членства Рэспублікі Беларусь у ЮНЕСКА.

5. Нацыянальная камісія мае правa:

уносіць ва ўстаноўленым парадку ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб асноўных напрамках і формах ажыццяўлення міжнароднага супрацоўніцтва краіны ў рамках ЮНЕСКА;

даручаць міністэрствам, іншым рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, арганізацыям Рэспублікі Беларусь падрыхтоўку прапаноў па пытаннях супрацоўніцтва з ЮНЕСКА ў межах іх кампетэнцыі;

заслухоўваць на сваіх пасяджэннях паведамленні міністэрстваў, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь па пытаннях супрацоўніцтва з ЮНЕСКА;

атрымліваць ад міністэрстваў і іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання неабходную інфармацыю і матэрыялы па пытаннях, што ўваходзяць у кампетэнцыю Нацыянальнай камісіі;

прыцягваць ва ўстаноўленым парадку для работы ў Нацыянальнай камісіі работнікаў міністэрстваў і іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і ўстаноў.

6. Персанальны склад Нацыянальнай камісіі, яе старшыня і адказны сакратар зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Нацыянальнай камісіі:

ажыццяўляе кіраўніцтва дзейнасцю Нацыянальнай камісіі;

каардынуе работу камітэтаў і рабочых органаў, што ствараюцца ў адпаведнасці з напрамкамі дзейнасці ЮНЕСКА;

арганізуе выкананне абавязацельстваў, якія вынікаюць з членства Рэспублікі Беларусь у ЮНЕСКА і ў адпаведнасці з яе Статутам і канвенцыямі, ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь;

прадстаўляе Рэспубліку Беларусь і Нацыянальную камісію ў адносінах з кіраўніцтвам ЮНЕСКА і замежнымі партнёрамі.

7. Пасяджэнні Нацыянальнай камісіі праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў год.

8. Нацыянальная камісія правамоцная прымаць рашэнні пры ўмове наяўнасці на пасяджэнні не менш як за дзве трэці яе членаў.

Рашэнні прымаюцца большасцю галасоў.

У рабоце Нацыянальнай камісіі з правам дарадчага голасу могуць удзельнічаць прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, якія дзейнічаюць у межах кампетэнцыі ЮНЕСКА. Прадстаўнікі гэтых аб'яднанняў могуць удзельнічаць у рабоце камітэтаў і іншых органаў, якія ўтвараюцца пры Нацыянальнай камісіі дзеля забеспячэння эфектыўнага супрацоўніцтва з ЮНЕСКА.

9. Нацыянальная камісія мае прэзідыум, які складаецца са старшыні, яго намеснікаў і адказнага сакратара. Прэзідыум нясе адказнасць за ажыццяўленне прынятага плана работы, прымае паміж пасяджэннямі Нацыянальнай камісіі ўсе неабходныя захады для выканання плана работы Нацыянальнай камісіі. Нацыянальная камісія мае свой валютны разліковы рахунак.

10. Справаводства і падрыхтоўку матэрыялаў да пасяджэнняў Нацыянальнай камісіі ажыццяўляе сакратарыят, які з'яўляецца рабочым апаратам Нацыянальнай камісіі і дзейнічае на правах сектара Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Сакратарыят Нацыянальнай камісіі ўзначальваецца адказным сакратаром.

Адказны сакратар Нацыянальнай камісіі кіруе работай сакратарыята, прадстаўляе Нацыянальную камісію ў іншых арганізацыях і ў адносінах з Сакратарыятам ЮНЕСКА, нацыянальнымі камісіямі іншых дзяржаў, прымае аператыўныя рашэнні па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Нацыянальнай камісіі, прадстаўляе агульнаму сходу Нацыянальнай камісіі праект плана работы, прымае аператыўныя рашэнні па пытаннях кампетэнцыі Нацыянальнай камісіі.

11. Рашэнні Нацыянальнай камісіі даводзяцца адпаведным арганізацыям у выглядзе выпісак з пратаколаў пасяджэнняў.